УДК 947.6(=411.6)”1914/1916”

# НЕКАТОРЫЯ ПРЫЧЫНЫ, ВЫНІКІ І УРОКІ ПЕРШАЙ І ДРУГОЙ СУСВЕТНЫХ ВОЙНАУ

**М.В. Цуба**
*Палескі дзяржаўны ўніверсітэт,* cubanm05@rambler.ru

Нягледзячы на істотную колькасць даследванняў навуковае асэнсаванне падзей Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў працягваецца. Гэта можна растлумачыць тым, што і праз 70 гадоў пасля Перамогі шматлікія пытанні застаюцца яшчэ не да канца высветленымі і зразумелымі.

У сёняшні час наша грамадства не задаволена часта аданабаковым, упрошчаным раскрыццём падзей вайны ў публікацыях шэрагу аўтараў. Бяспрэчна, што Перамога ў вышэй адзначаных войнах – гэта вынік не толькі разгрому немецка–фашыцскіх войск у кравапралітных бітвах на фронце (вядома, што на працягу Другой сусветнай вайны на яе франтах ваявала звыш 1 млн. беларусаў), гэта рэзультат не толькі дзейнасці партызанскага руху і падпольшчыкаў (на працягу вайны на беларускіх землях ваявала 444 тыс. партызан і падпольшчыкаў), таксама гэта не толькі самаадданая праца ўсіх людзей ў савецкам тылу, але і пераадольванне пагубных уздзеянняў нічым не апраўданных масавых рэпрэсій, значных пралікаў у абарончым і гаспадарчым будаўніцтве, памылковых меркаваннях аб сілах ворага і яго намерах, часта беспадстаўных рашэннях і некампетэнтным кіраўніцтве ваеннымі дзеяннямі з боку Сталіна і яго падначаленых. Усё гэта запатрабавала, менавіта ад простых народных мас неверагодных намаганняў, нашмат павялічыла бедствы народа, яго пакуты і ахвяры.

Разам з гэтымі недастатакова вывучанымі аспектамі шмат навуковых дыскусій, у наш час, вядзецца наконт развязвання вайны. Па сённяшні дзень задаюцца пытанні: як гэта адбылося? Якія прычыны прывялі да пачатку вайны? Якія ўрокі патрэбна вынесці? І тут неабходна прызнаць, што самы вялікі ў свеце па ахвярах і разбуральных маштабах ваенны канфлікт запылаў не выпадкова, а быў вынікам шматлікіх прычын. Без сумнення, адной з галоўных прычын з’яўлялася Першая сусветная вайна, якая не столькі вырашыла, колькі абвастрыла супярэчнасці паміж вялікімі дзяржавамі свету, што з цягам часу прывяло чалавецтва да новай, яшчэ больш страшнай і разбуральнай, – Другой сусветнай вайны.

Менавіта, узнікненне гэтага глабальнага канфлікту была непарыўна звязана сваімі каранямі з Вярсальскай сістэмай міжнародных адносін. На дадзеным міжнародным форуме краіны–пераможцы ў Першай сусветнай вайне ў форме дыктата заставілі германскую дэлегацыю 28 чэрвеня 1919 г. у Вярсальскім палацы падпісаць імі складзены мірны Дагавор. Згодна з дагаворам Германія аб’яўлялася галоўнай віноўніцай вайны. У выніку тэрытарыяльныя страты Германіі і асабліва празмерныя выплаты рэпарацый прывялі вялікую частку нямецкага насельніцтва да жабрацтва і паставілі ў зневажальнае становішча Германію. Тым самым былі створаны неабходныя ўмовы для развіцця ідэі рэваншу і адраджэння ачага мілітарызму у самым цэнтры Еўропы.

ПолесГУ

Напрыканцы 1932 г. у Германіі распачаліся выбары ў рэйхстаг. Створаны прадвыбарны блок сацыял–дэмакратычнай і камуністычнай партый Германіі амаль не даваў ніякіх шансаў для перамогі нацыянал–сацыялістычнай рабочай партыі Германіі, якую ўзначальваў Адольф Гітлер. Аднак і тут не абышлося без памылкі Іосіфа Сталіна, менавіта Сталін парэкамендаваў кіраўніку нямецкіх камуністаў Эрнсту Тэльману змагацца за чысціню радоў сваёй партыі і тым самым разарваць блок з сацыял–дэмакратамі, што і было зроблена. У выніку выбараў, якія завяршыліся ў 1933 г. перамогу атрымала партыя Гітлера. Вядома, што галоўным лозунгам гэтай партыі падчас выбараў з'яўляўся рэвашчыцкі лозунг вылучаны Гітлерам – "Разарвём версальскія аковы"[1,с.578].

Пасля прыходу Гітлера да ўлады Версальскі мір ужо больш нагадваў перамір'е, якое ў рэшце рэшт павінна было скончыцца вайной.

На пачатку Другой сусветнай вайны Германія не толькі аднавіла, але і істотна пашырыла на новай матэрыяльна–індустрыяльнай аснове сваю ваенна–тэхнічную і эканамічную базу, поўнасцю праігнараваўшы версальскія дамоўленасці.

Распрацаваная Гітлерам і яго падначаленымі праграма прадугледжвала поўнае заняволенне і знішчэнне "непаўнацэнных" народаў, разгром Польшчы, ліквідаванне Францыі і Англіі, авалоданне рэсурсамі Еўропы, знішчэнне СССР і ўсталяванне на яго тэрыторыі "новай жыццёвай прасторы". Канчатковай мэтай акрэслівалася ўстанаўленне сусветнага панавання[2,с.24,30,46].

Рост узаемнай падазронасці і недаверу адзін да аднаго з боку палітычных лідэраў буйнейшых краін заходняй Еўропы, ЗША і СССР прывёў да таго, што яны былі не ў стане асэнсаваць новыя рэальнасці і патрабаванні, не маглі ўсвядоміць агульначалавечую пагрозу нацызму. Сярод іх пераважалі не жаданне дасягнуць кампрамісу і ўзаемаразумення, не клопаты аб агульначалавечых каштоўнасцях, а ўпартае імкненне прытрымлівацца сваіх ідэалагічных прыярытэтаў, якія былі пакладзены ў аснову міждзяржаўных адносін. Не дзіўна, што такія падыходы не здолелі прадухіліць пачатак вайны. І толькі з пачаткам ваенных дзеянняў развязанных Германіяй і яе саюзнікамі наступіла ўсведамленне неадкладнай неабходнасці радыкальнага пералому ў адносінах паміж вышэй адзначанымі краінамі. Мэнавіта гэтая становучая акалічнасць з цягам часу і прывяла да агульнай перамогі над ворагам. Шкада, але ж і праз шматлікія дзясяцігоддзі пасля, Першай і Другой сусветных войнаў урокі і вынікі гэтых войнаў не навучылі свет жыць без ваенных канфліктаў і насілля. Хаця добра зразумела, што шлях вызвалення чалавецтва як ад лакальных, так і ад вялікіх войнаў залежыць ад усеагульнага раззбраення, спынення непрыязнасці ў міжнародных адносінах, сяброўства і супрацоўніцтва паміж рознымі народамі.

У заканчэнне хацелася б для параўнання прывесці асноўныя паказчыкі Першай і Другой сусветных войнаў.

Табліца – Асноўныя паказчыкі Першай і Другой сусветнай вайнаў

| | Асноўныя паказчыкі | Першая сусветная вайна (1914–1918) | Другая сусветная вайна (1939–1945) |
|---|---|---|---|
| 1. | Працягласць вайны | 4 гады і 3,5 месяцаў | 6 гадоў |
| 2. | Колькасць дзяржаў, якія ўдзельнічалі ў вайне | 38 | 61 |
| 3. | Колькасць насельніцтва дзяржаў, якія ваявалі | Звыш 1 млрд чал. | Звыш 1,7 млрд чал |
| 4. | Агульная плошча тэатраў ваенных дзеянняў | Звыш 4 млрд кв. км Звыш 70 млн чал. | Звыш 22 млн кв. км |
| 5. | Колькасць мабілізаваных ва ўзброеныя сілы | Звыш 13,6 млн чал | Звыш 110 млн чал. |
| 6. | Забіта і памерла ад ран | Звыш 20 млн чал. | Звыш 60 млн чал |
| 7. | Паранена і пакалечана | 360 | Звыш 90 млн чал. |
| 8. | Матэрыяльныя страты (у млрд долараў) | | 4000 |
| | У тым ліку прамыя ваенныя расходы | 208 | 1117 |

Прымячанне – Крыніца: [3,с.155,156]

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

1. Всемирная история. Эпоха мировых войн (А.Н. Бадак, И.Е. Войнич, Н.М. Волчек и др. – Минск: Харвест, 2007.–1440с.

Полесу

2. Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны: Вучэб. дапаможнік / А.А.Каваленя і інш.; Пад рэд. А.А.Кавалені. Мн.: Акад.МУС Рэс. Беларусь, 2004.–124с.

3. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): справочник авт. – сост. А.А.Коваленя, М.А.Краснова, В.И.Лемешонок; под ред. А.А.Ковалени. – Минск: Изд. Центр БГУ, 2007.–235с.
ПолесГУ